За каждый час работы в ночное время или в ночную смену при сменном режиме работы производятся доплаты в размере, устанавливаемом коллективным договором, соглашением, нанимателем, но не ниже 20 процентов часовой тарифной ставки (оклада) работника, а для бюджетных организаций и иных организаций, получающих субсидии, работники которых приравнены по оплате труда к работникам бюджетных организаций Правительством Республики Беларусь или уполномоченным им органом. При этом ночной сменой считается смена, в которой более 50 процентов времени приходится на ночное время (ст. 70).

Если работник принят на работу только в ночное время, доплата должна производиться за каждый час работы — не менее указанных выше нормативов.

При определении размера денежного вознаграждения за труд ночного сторожа в совхозе надо учитывать и положение ст. 20 Трудового кодекса Республики Беларусь: наниматель не вправе требовать от работника выполнения работы, не обусловленной трудовым договором, за исключением случаев, предусмотренных законодательными актами, — пояснил юрист.

Анна ВОЛОДАЩУК



Ночной сторож принимает отелы коров, обрабатывает их, переносит телят в другую клетку, и каждый час обязан подкидывать коровам корма

Уважаемые читатели!

В нашей газете работает рубрика «Ответы юриста». На Ваши вопросы ответят профессиональные юристы-эксперты. Присылать свои вопросы можете на адрес: 231800, г. Слоним, ул. Красноармейская, 41, на электронный адрес gazslon@gmail.com, в скайп mikola_by1 или в SMS-сообщении на номер +375 29 584-87-32.

ТРЫБУНА

БУДЗЕМ ЦВЯРОЗІЦЦА?

Нашыя нязменныя новаабраны прэзідэнт і міністр аховы здароўя, які паспеў зысці ў адстаўку і зноў, падобна Феніксу, узнікшаму з попелу, заняць сваю пасаду, сінхронна выступілі з заявамі, ацэньваючы некаторыя аспекты беларускай сістэмы аховы здароўя.



Медыкі пішуць, пішуць і пішуць

Міністр распавёў электарату, што ў 2016 годзе будзе вырашана адна з асноўных праблем нашай аховы здароўя — кадравая праблема ў гэтым ведамстве. Трэба думаць, пасля гэтага не будзе чэргаў да лекара. Дэфіцыт кадраў плануюць вырашыць за кошт выпуску новых маладых спецыялістаў і насычэння імі медыцынскіх устаноў. Пры гэтым усе лекары будуць працаваць на адну стаўку, без сумяшчальніцтва, або, у крайнім выпадку, на 1,2 стаўкі. Міністр сказаў, што захаваецца сярэдняя зарплата лекараў — каля 10 млн. беларускіх рублёў, якую, па словах міністра, яны сёння маюць з улікам сумяшчальніцтва.

Можна было б парадавацца за калегаў, але трохі ведаючы нашу сістэму аховы здароўя знутры, думаю, што спадар міністр проста хітрые. Магчыма, асобныя лекары, якія маюць вялікі стаж працы, высокую катэгорыю, якія праводзяць складаныя аперацыі або якія маюць іншыя надбаўкі, і зарабляюць агучаныя грошы. Але не маладыя спецыялісты, не дактары паліклінік і не працуючыя на «голую» стаўку. Падзяліце атрыманую суму на два і вы атрымаеце столькі іх заробку. Не выклікае асаблівага аптымізму і намер ліквідаваць дэфіцыт кадраў (па некаторых звестках да 30%) за кошт маладых спецыялістаў. Думаю, што гэта будзе азначаць значнае зніжэнне якасці аказваемай дапамогі, таму што вопыт у лячэбнай дзейнасці мае усё ж вызначальнае значэнне.

А вось Лукашэнка на сустрэчы з дырэктарам Еўрапейскага рэгіянальнага бюро СААЗ Жужай Якаб заявіў, што ў Беларусі забяспечаны роўны доступ насельніцтва «да аб`ектаў аховы здароўя», дзякуючы жорстка адбудаванай вертыкальнай сістэме аховы здароўя. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ў Беларусі, у адрозненні ад некаторых дзяржаў, не бывае такога, калі «пад плотам памірае чалавек пры адсутнасці ў яго страхоўкі».

«Гэтага ў нас няма, мы заўсёды лечым аднолькава ўсіх людзей», — адзначыў прэзідэнт.

Вазьму на сябе смеласць запярэчыць кіраўніку дзяржавы. Якраз жорсткая вертыкаль ў сістэме аховы здароўя з`яўляецца тормазам у яе развіцці, гасіць ініцыятыву, спараджае паператворчасць, бюракратызм і абыякавасць. Зразумела, што ні пра якую роўнасць у даступнасці да якаснай медыцынскай дапамогі ва ўмовах расслаення насельніцтва па ўзроўні даходаў не можа быць гаворкі, бо магчымасці багатых і бедных абсалютна розныя. Што тычыцца смерці «пад плотам», то ў любой цывілізаванай краіне экстраная дапамога аказваецца незалежна ад магчымасці яе аплаціць. Напрыклад, у ЗША, дзе медыцына платная, бамжу, які паміраe «пад плотам» самай крутой клінікі, спачатку акажуць дапамогу, а затым ужо будуць шукаць сродкі на аплату гэтай самай дапамогі. Калі ж чалавеку няма чым заплаціць, то сацыяльныя службы гэта зробяць праз спецыяльныя фонды. Так што тут нам няма чым асабліва хваліцца.

Сцвярджэнне кіраўніка дзяржавы, што ў Беларусі паслугі аховы здароўя бясплатныя, таксама, мякка кажучы, далёкае ад ісціны. Пасля ўвядзення платных паслуг, калі грамадзяне Беларусі вымушаны з уласнай кішэні аплачваць значную частку дыягностыкі і лячэння, гарантаванае нам канстытуцыяй права на бясплатнае медыцынскае абслугоўванне ў нас адабралі.

Няма чым нам пахваліцца і ў згаданым Лукашэнкам старанні ўладаў далучаць грамадзян да здаровага ладу жыцця, прапагандзе адмовы ад шкодных звычак. Варта ўзгадаць пра антытытунёвы закон, які ніяк не могуць прыняць на працягу шэрагу гадоў, і аб аднаўленні ў поўным аб`ёме гандлю спіртным перад нядаўнімі выбарамі, і аб адпісках на звароты ў мясцовыя органы ўлады з нагоды тытунёвых кіёскаў, і аб адміністрацыйным пакаранні актывістаў за вывешванне прапагандысцкіх матэрыялаў за здаровы лад жыцця.

Так што ў сферы аховы здароўя беларусам ёсць над чым думаць і ёсць што мяняць. Толькі трэба не хваліцца, не прыгладжваць, не ўводзіць у зман людзей, а рэфармаваць сістэму аховы здароўя, каб яна сапраўды магла стаць і даступнай, і якаснай, і эфектыўнай. Гэта немагчыма без шырокага абмеркавання ў грамадстве, без сумеснай працы спецыялістаў, прадстаўнікоў улады і грамадскіх арганізацый. Якасная ахова здароўя аднолькава патрэбна ўсім у незалежнасці ад займаемай пасады, поглядаў ці таго, як ты галасаваў на выбарах. Нельга аддаваць спробу рэфармаваць ці мадэрнізаваць нашу медыцыну толькі на водкуп вертыкалі, бо зробяць яшчэ горш.

Іван ШЭГА

С НАТУРЫ

И ТАКОЕ БЫВАЕТ



МАЛЮНАК ЯЎГЕНА ІВАНОВА

В продмаге мужчина лет сорока, покачиваясь у кассы, расклеивал упаковочный пакет, чтобы сложить туда батон, две упаковки молока и чипсы. Но пакет не расклеивался. Мужчина тер его руками, качаясь корпусом тела из стороны в сторону, будто это могло помочь. Затем плевал на пальцы и снова тер пакет. Две створки пакета склеились прочно. Тогда он дуть начал, как дуют в резиновый шарик для детей, но воздух не проникал меж створок.

Мужчина был очень спокоен, настойчив и даже усерден. Пакет ему попался явно не сговорчив и не для того, чтоб им любоваться — был весь белый, вырисовывались всего два слова красными буквами сверху вниз. Наконец, мужчина надоел кассирше, и она попросила отойти в сторону. Он собрал свои покупки и послушно отошел к столу, где стояли покупательские корзины и продолжил единоборство с пакетом по открыванию створок. Бесполезно. Но тут появился товарищ, чуть младше и более решительный.

— Что ты возишься? — говорит. — Не можешь открыть?

— Не могу, — согласился он.

Товарищ стал энергично тереть створки пакета, дергать их и порвал слегка. Но пакет не открывался даже порванный.

— А попробуйте вы, — нашел он решение и подал пакет кассирше.

Она не хотела его брать и говорит:

— Сейчас милицию вызову.

— Если милиция поможет открыть, вызывайте, — согласился мужчина.


— Вот заберут вас тепленьких, будете там всю ночь открывать этот пакет, — парировала кассирша.

— Хорошо, вызывайте, — не испугались мужчины.

— Ладно, дайте я, — кассирша взяла злополучный пакет, потерла пальцами. Не получилось и у нее. Потерла еще, взяла новый пакет, открыла его. Протянула мужикам. — Нате другой, а этот, видимо, с дефектом.

Конфликт был исчерпан очень простым способом. Лица у людей, что начали скапливаться возле кассы, были злыми. Не любят наши люди терять время даром.

Владимир ШУМЕЛЬ



Алексей ШЛЯХТИН

Слоним. Наши улицы

УЛИЦА ИМЕНИ ПАЛАЧА

В Москве 1 ноября стартует интернет-голосование, которое даст возможность москвичам высказать свое мнение о том, нужно ли переименовывать станцию метро «Войковская».

Русские спорят

Споры вокруг переименования метро «Войковская» не утихают в Москве вот уже несколько лет. Сторонники такого переименования говорят о том, что абсолютно неприемлемо то, что один из районов Москвы и станция метро названы именем человека, который является одним из организаторов расстрела семьи последнего русского императора.

В ночь с 16 на 17 июля 1918 года в Екатеринбурге Петр Войков лично участвовал в убийстве Николая II, его жены Александры и их пятерых детей — царевен Ольги, Татьяны, Марии, Анастасии и цесаревича Алексея. Вместе с ними был убит доктор царской семьи Евгений Боткин, повар Иван Харитонов, камердинер Алексей Трупп и горничная Анна Демидова.

Противники переименования станции говорят, что не стоит копаться в прошлом, что почти никто уже и не помнит, кто такой был Войков, и для большинства это просто название района Москвы и станции метро, к которым они привыкли.

Но ведь есть преступления, которые не имеют срока давности, есть злодеяния, которые не должны быть забыты, дабы не повторились вновь. И конечно же кощунственно выглядит ситуация, когда, с одной стороны, члены царской семьи почитаются чуть ли не святыми, а с другой — целый район Москвы назван именем человека, непосредственно убивавшего этих людей — так отвечают сторонники перемены названия.



Памятник Войкову в Москве. Наши дни



Советская почтовая марка к столетию Петра Войкова

Стоить отметить, что вопрос о переименовании одноименного района Москвы власти пока даже не рассматривают в связи с тем, что это повлечет проблемы со сменой адресов и т.п.

Войков в Слониме

Есть улица имени Войкова и в нашем городе. Думаю, если спросить наших горожан, кто такой Петр Лазаревич Войков, чем он занимался и чем печально знаменит, найдется не так много людей, которые смогут в полной мере ответить на этот вопрос. Да и зачем это нужно, скажут многие. Есть название улицы, к нему привыкли, и не надо лишнего ворошить.

А все-таки если подумать? Ведь по этим улицам ходят наши дети, и, наверное, кто-то из них спросит нас: а кто был это человек? А если и не спросят, то, верно, подумают про себя: «Наверное, это был какой-то выдающийся человек, раз его именем названа улица. Наверное, он сделал много хорошего».

В 2009 году вопрос о переименовании в Слониме улицы Войкова уже поднимался группой людей, однако тогда власти ожидаемо ответили отказом, сославшись на то, что участие Войкова в расстреле царской семьи не было доказано и что против такого переименования выступает большинство жителей улицы.

Как это было

Интересно, на основании какого опроса жителей улицы Войкова был сделан вывод о том, что большинство не согласно с переименованием?

Что касается доказанности участия Войкова в расстреле, то здесь всё уже давно доказано.

Вот какую историческую справку дал Институт российской истории по этому вопросу: «П.Л. Войков, являясь членом Уральского областного совета, участвовал в принятии решения о расстреле Николая II, его жены, сына, дочерей и их спутников. Участник расстрела царской семьи екатеринбургский чекист М.А. Медведев (Кудрин) указывает Войкова в числе принявших решение об уничтожении семьи Николая II. Войков активно участвовал в подготовке и сокрытии следов этого преступления...»



И в Слониме есть такая улица

Сохранились воспоминания бывшего дипломата Г.З. Беседовского, в которых содержится рассказ самого П.Л. Войкова о его участии в цареубийстве.

«Вопрос о расстреле Романовых был поставлен по настойчивому требованию Уральского областного Совета, в котором я работал в качестве областного комиссара по продовольствию... Центральные московские власти не хотели сначала расстреливать царя, имея в виду использовать его и семью для торга с Германией... Но Уральский областной Совет и областной комитет коммунистической партии продолжали решительно требовать расстрела... Я был одним из самых ярых сторонников этой меры...» — рассказывал Войков.

«... Когда все стихло, Юровский, Войков и двое латышей осмотрели расстрелянных, выпустив в некоторых из них еще по несколько пуль или протыкая штыками... Войков рассказал мне, что это была ужасная картина. Трупы лежали на полу в кошмарных позах, с обезображенными от ужаса и крови лицами. Пол сделался совершенно скользким, как на бойне...

Уничтожение трупов началось на следующий же день и велось Юровским под руководством Войкова и наблюдением Голощекина и Белобородова... Войков вспоминал эту картину с невольной дрожью. Он говорил, что, когда эта работа была закончена, возле шахты лежала громадная кровавая масса человеческих обрубков, рук, ног, туловищ и голов. Эту кровавую массу поливали бензином и серной кислотой и тут же жгли двое суток подряд... Это была ужасная картина, — закончил Войков. — Мы все, участники сжигания трупов, были прямо-таки подавлены этим кошмаром. Даже Юровский и тот под конец не вытерпел и сказал, что еще таких несколько дней — и он сошел бы с ума...» — цитата из источника: Беседовский Г.З.

Что же касается юридического аспекта признания виновности, действительно, суда над Войковым не было, и он не был признан виновным. Но по факту его участие в этом преступлении не подвергается сомнению.

Наследие Петра Войкова

За время советской власти по всей тогдашней огромной стране именем Войкова было названо огромное количество улиц. По данным фонда «Возвращение», в России, Беларуси и на Украине существует как минимум 131 улица имени Войкова.

Не знаю, проведут ли в нашем городе когда-нибудь голосование по поводу переименования улицы Войкова. Но когда нас спросят наши дети: «А кто был такой этот Войков? И почему в честь него назвали улицу?» — мне бы очень хотелось, чтобы мы ответили нашим детям откровенно. И при этом нам не было стыдно.

ЮБИЛЕЙ

СЛОНИМСКОМУ ВОДОПРОВОДУ ИСПОЛНИЛОСЬ 120 ЛЕТ

В 1895 году в Слониме произошло событие, во многом предопределившее его дальнейшее развитие — завершилось строительство первой очереди водопровода. И вот 23 октября Слонимскому водопроводу исполнилось 120 лет.

По этому поводу накануне праздника, 22 октября, в Слонимском драмтеатре собрались работники и руководители ОАО «Слонимский водоканал», чтобы торжественно отметить юбилей.

Первые слова поздравления и благодарности всем присутствующим сказал директор Слонимского водоканала Василий Шкодов, который руководит предприятием уже тридцать лет. Также выступил бывший директор водоканала Константин Зубко, который руководил предприятием с 1979 по 1984 года.

С праздником пришли поздравить руководители Слонимских предприятий и многие другие. В торжественной обстановке были вручены почётные грамоты, благодарственные письма лучшим работникам водоканала.

Приказом Министерства ЖКХ Республики Беларусь нагрудными знаками «Заслуженный работник ЖКХ» были награждены Василий Добриян и Олег Конон.

К 120-летию Слонимского водопровода вышла книга под названием «Традиция живой воды».

ИСТОРИЧЕСКАЯ СПРАВКА:

Согласно дошедшим до нас древним источникам, слонимский водопровод является одним из старейших водопроводов в стране. В дореволюционной Беларуси водопроводы были только в семи городах, в том числе в Слониме, в котором проживало около 16 тысяч человек. Официально история Слонимского водопровода датируется 1895 годом. Тогда Городская Дума заключила с предпринимателем Гиршей Куницей контракт на строительство в Слониме городского водопровода. Работы по стройке не останавливались и велись успешно. Строительство первой очереди водопровода было завершено в октябре 1895 года. Открытие же водопровода состоялось в 1896 году. Мощность его была 1 800 вёдер в час и 43 200 вёдер в сутки.

Татьяна ПЛАХЕТКО
Фото автора



Награждали лучших работников



На торжественном мероприятии



Нагрудным знаком «Заслуженный работник ЖКХ» был награжден Олег Конон (справа)

ПРОИСШЕСТВИЕ

В СЛОНИМЕ НЕ РАЗЪЕХАЛИСЬ ДВА БУСА

В Слониме на Шоссейной улице в пятницу, 23 октября, произошло ДТП.

Два буса, газель и «Фольксваген», не поделили дорогу.

По предварительной версии, водитель одного авто пошёл на разворот, а водитель другого — на обгон. Пострадавших в аварии нет.

Кто виноват, установит следствие.

Татьяна ПЛАХЕТКО
Фото автора





На месте аварии

З ПОЛЬСКАГА ДЗЁННІКА

ХОЧАШ НЕ ХОЧАШ — ВЫБІРАЙ,

ці як праходзяць парламенцкія выбары ў польскай правінцыі

Журналісты з чатырох краін — Малдовы, Туніса, Азербайджана і Беларусі — былі запрошаны ў Польшчу для асвятлення парламенцкіх выбараў. Карэспандэнту «ГС» таксама было прапанавана цягам дзесяці дзён назіраць за гэтым працэсам у польскім горадзе Слупцы.



Абнаўляюцца плакаты



Плакаты з выявамі кандыдатаў

Мімалётная сустрэча

18 кастрычніка. Месцам сустрэчы групы беларускіх журналістаў, запрошаных у Польшчу з чатырох незалежных рэгіянальных выданняў, быў Нацыянальны аэрапорт Мінск. Адтуль наш шлях ляжаў самалётам на Варшаву, а пасля цягніком у польскія гарады Слупцу і Мелец у рэдакцыі мясцовых газет.

Ужо выпіты кубачак кавы перад вылетам і апрабаваны Wi-Fi ў аэрапорце. Застаецца некалькі хвілін да пасадкі.

— Гэта ж Святлана Алексіевіч, глядзіце! — раптам гучна шэпча каляжанка з барысаўскай газеты.

Было ўзрушана бачыць зусім побач нашу нацыянальную гордасць — наваспечанага нобелеўскага лаўрэата па літаратуры. Святлана Аляксандраўна прысела ў чаканні самалёта за свабодны столік. Сціпла і зручна апранутая, паспартыўнаму.

Да пісьменніцы адразу падышоў журналіст з лунінецкай газеты і сябра Саюза пісьменнікаў Мікалай Ільючык. Даўно знаёмыя, яны пагутарылі некалькі хвілін, што засталіся да адлёту. Мы ж не асмельваліся падыходзіць да медыяперсоны, імя якой цяпер на слыху не толькі ў нашай краіне, а толькі нясмела рабілі здымкі на тэлефоны. Але, як пасля сказаў калега, Святлана Аляксандраўна да фатаграфавання без яе дазволу ставіцца памяркоўна.

Ляцела нобелеўскі лаўрэат да Варшавы разам з намі і шматлікай групай мітуслівых кітайцаў — у эканом-класе, седзячы ў апошнім радзе, праз рад ад нашых крэслаў. Пасля прыбыцця ў сталіцу польскія сцюардэсы, якім лунінецкі журналіст паведаміў, што ў іх самалёце ляціць нобелеўскі лаўрэат, уручылі Святлане Алексіевіч падарунак. А дабіралася яна да Кракава, дзе было запланавана яе выступленне.

Мы ж, сустрэўшыся ў варшаўскім аэрапорце імя Шапэна з арганізатарамі паездкі і журналістамі з Малдовы, са спазненнем на 40 хвілін — на чыгунцы здарылася аварыя з таварным цягнікам — былі а дзясятай гадзіне вечара ў Слупцы.



Святлана Алексіевіч у аэрапорце Мінск-2

Слупца напярэдадні выбараў

19 кастрычніка. Польская Слупца знаходзіцца больш чым за 200 кіламетраў ад Варшавы. Колькасць жыхароў у Слупецкім павеце такая ж, як і ў Слонімскім раёне, каля 65 тысяч, аднак у самім горадзе налічваецца каля 14 тысяч жыхароў (столькі, колькі жыве ў нас у вёсках). Але, як зазначае рэдактар «Кур`ера Слупецкага» Януш Ансіён, які праводзіць для нас невялікую экскурсію па горадзе, насельніцтва памяншаецца — моладзь з`язджае на Захад у пошуках большых заробкаў і лепшага жыцця.

Па дарозе Януш паказвае на прыватны дом у Слупцы, рэклама на якім заклікае набываць матэрыял для дахаў менавіта ў гэтай фірме.

—Вось так правільна — кожны павінен мець уласны бізнес, каб працаваць на сябе, — зазначае Януш. Тут не паспрачаешся, ды і каму іншаму ведаць гэта лепш, як не Янушу, які паспяхова вядзе свой бізнес, выдаючы «Кур`ер Слупецкі» 12 гадоў ва ўмовах канкурэнцыі на мясцовым медыярынку, прадстаўленым, дарэчы, яшчэ дзвюма газетамі — прыватным выданнем «Газета Слупецкая» і дзяржаўнай газетай «Голас Слупцы».

У гэтым правінцыйным горадку маецца 6 школ, з іх 2 пачатковыя, а таксама 1 гімназія, музычная школа і два тэхнікумы.

Праходзім ля адной са школ, на якой вывешаны сцягі.

—Гэта бастуюць настаўнікі, — як ні ў чым не бывала, кажа Януш.

На нашы запытальныя погляды ён тлумачыць, што настаўнікі страйкуюць звычайна раз на год, вывешваючы ў знак пратэсту сцягі, аднак на працу выходзяць і працуюць, вучаць дзяцей. Так, з 1 верасня на дзвярах гэтай пачатковай школы вісяць вытрымкі з арганізаванай прафсаюзам польскіх настаўнікаў пратэснай акцыі, сярод якіх патрабаванне выдзяляць больш грошай на школьную адукацыю, павялічыць на 10% базавую пенсію настаўнікаў, выдзяляць 1% з бюджэту на прафесійнае ўдасканаленне кадраў.

Падумалася, што ў нас з такімі пратэстамі і сцягамі не задурэеш, і чамусьці ўспомнілася «Пагоня» на майках кадэтаў і гвалт, узняты пасля гэтага.

Дарэчы, на дарогах Слупцы мы не заўважылі ніводнага спячага паліцэйскага, затое маецца многа пешаходных пераходаў і зусім мала святлафораў. Пры тым на вулках днём нешматлюдна. Гарадскі транспарт ў гарадку не ходзіць, акрамя як на ўласных машынах, жыхары ездзяць і на роварах.

А турысты, як падалося, тут наогул з`ява даволі рэдкая, бо на нашу беларускую і рускую гаворку абарочваліся як наведвальнікі рэстарана, дзе мы абедалі, так і мінакі на вуліцы.

—Вы з Украіны? — запытаў пажылы чалавек на вуліцы, які са сваімі сябрам звярнуў увагу на нашыя расчахлёныя фотаапараты.

—Не, з Беларусі, — і пасля кароткай паўзы тлумачым выпадковым суразмоўцам: — Адтуль, дзе Лукашэнка.

Той з дзядкоў, што назваўся Міхалам, хутка зарыентаваўся ў геаграфічнай і палітычнай сітуацыі:

—Такі тэрмін — гэта свінства... — пачаў казаць субяседнік, але працягнуць яму не даў яго таварыш, які ледзь не стаў затыкаць рот сябру далонню, а пасля і зусім зышоў, махнуўшы рукой. Ну проста як наш палахлівы беларус — так падалася гэтая сітуацыя.

Але ж Міхалу хацелася пагаварыць. Ён распавёў, што ў школе ён вывучаў рускую мову, а ягоныя ўнукі цяпер вывучаюць ангельскую, французскую ды іспанскую мовы. Наша пытанне, колькі ён атрымлівае пенсіі, ён ці то не зразумеў, ці то зрабіў выгляд, што не зразумеў (як заўважыў пасля калега, палякі і немцы не вядуць гаворкі ў кампаніі пра свае заробкі). А вось наконт парламенцкіх выбараў у выказваннях наш суразмоўца сябе не абмяжоўваў, даводзячы, што бачыў усіх гэтых палітыкаў у адным месцы.

Праўда, не звяртаць увагі на палітыкаў нельга — іх выявы ў Слупцы сустракаеш ледзь не на кожным кроку. Паглядаюць яны ўсе разам на сваіх выбаршчыкаў з афішных тумбаў, якіх толькі ў цэнтры мы налічылі тры, з плакатаў розных памераў, што вісяць на слупах і платах. У сувязі з гэтым успомнілася наша нядаўняя кампанія па выбарах прэзідэнта: напэўна, каб у Слупцы віселі такія сціплыя абвесткі з выявамі кандыдатаў, як і ў нас, то пра выбары — не тое што парламенцкія, але і прэзідэнцкія — ніхто б і не здагадаўся.

А ці апынецца ў парламенце нехта з 10 слупецкіх кандыдатаў, што цяпер з платоў і слупоў углядаюцца ў вочы кожнаму патэнцыйнаму выбаршчыку, даведаемся толькі ў дзень выбараў.

Наталля ІВАНОВА
Фота аўтара
Працяг будзе



У восеньскім скверы

10-Й КОМАНДНЫЙ КУБОК РБ

18 октября в Гомеле прошел 10-й командный кубок Республики Беларусь по карате Киокушинкай. В турнире участвовало 5 команд из различных регионов Беларуси.



Слонимские каратисты

Слоним представлял спортивный клуб «Доджо Киокушин». Соревнования проходи в разделе кумитэ (бои). От Слонима выступили в весе до 70 кг — Кузьмицкий Евгений, в весе до 80 кг — Мазаник Дмитрий, в весе свыше 80 кг — Циркун Александр и Клыбик Максим. В полуфинале слонимчане победили прошлогодних чемпионов (команда г.Светлогорска), а в финале уступили команде г.Гомеля, в итоге — 2-е место.

Так же в этот день из Японии пришли черные пояса Хирковскому Евгению (1 дан), Шурко Станиславу (1 дан) и Левищенко Дмитрию (2 дан). Экзамен ребята прошли успешно еще летом.

Поздравляем ребят с отличным выступлением и получением черных поясов. Желаем дальнейших побед и крепкого здоровья.

ОСУ!

Максим МИСКО

ФУТБОЛЬНЫЙ КАЛЕЙДОСКОП

ПРОБИЛ ТОЧНО В УГОЛ ВОРОТ

В Минске 24 октября состоялся товарищеский матч по футболу среди мальчиков 2005 года рождения: ФК «Фортуна» — «Талант» (Слоним).

Встреча прошла на футбольной площадке уменьшенных размеров. Наверное, это помешало подопечным Руслана Корнева показать в полной мере своё мастерство.

Гости первыми сумели огорчить минчан, на перехват мяча решился Арсений Герасимчик и хладнокровно закатил мяч в ворота. Не успели хозяева прийти в себя, как последовал коллективный отбор мяча от гостей, а один из защитников «Фортуны» срезал мяч в собственные ворота — 0:2.

Постепенно минчане стали выравнивать игру, а розыгрыш углового удара принёс им успех. Слонимчане провели ряд замен и сумели навязать вновь избранный темп игры.

Во второй половине матча гости сумели развить свой успех точным ударом Андрея Болвана, а когда роль наконечника в атаке выпала на Кирилла Зазулю, он не сплоховал — пробил точно в угол ворот.

Закрепил успех Арсений Герасимчик, на что хозяева ответили лишь однажды. Окончательный счёт 5:2 в пользу «Таланта».

Слонимчане получили официальное приглашение принять участие в международном турнире «Кубок «Фортуны»-2015», который пройдёт в столице в конце ноября. Помимо белорусских юношей, ожидается участие команд России, Латвии, Эстонии, Румынии.

Егор ЖИГАЛИК
Фото автора



Не убежит!



Встретились в центре поля

ФУТБОЛЬНЫЙ КАЛЕЙДОСКОП

РАЗОШЛИСЬ МИРОМ



На стадионе «Газпром трансгаз Беларусь» прошёл последний матч по футболу в рамках утешительного раунда первенства Гродненской области среди юношей 2002 года рождения этого сезона. Команды оспаривали 7-12 места.

Встреча сверстников Слонима и Щучина прошла под диктовку хозяев, которые на протяжении всей встречи лучше контролировали мяч, но сами пропускали.

К середине первого тайма слонимчане умудрились прозевать три голевые атаки. А вот после перерыва начали исправлять свои ошибки. Первый мяч в ответ забил Владислав Зенько, а затем дубль на свой счёт записал Артём Гурский. Когда счёт стал равным — 3:3, хозяева имели все шансы на победу, но отличиться не сумели.

Егор ЖИГАЛИК

ЧЕМПИОНАТ БЕЛАРУСИ ПО ФУТБОЛУ. ПЕРВАЯ ЛИГА

ВСЁ РЕШИЛ ОДИН УДАР

ФК «СЛОНИМ» — ФК «БЕРЁЗА» — 0:1 (0:1)
25 октября. г. Слоним. Стадион «Юность», 500 зрителей.
Судья — В. Русак (Минск)
Голы: 0:1 — Бондаренко, 37
«Слоним»: Берг С. — Жуков, Палазник (Герасимчик, 46), Красий, Снопко (к) — Щербаков, Бальбух (Михновец, 60), Пузач, Гречиха, Подрецкий (Глебов, 46), Шаков.
Тренер — Алексей Шубенок

Со стартовым свистком арбитра хозяева бросились в атаку и были близки к успеху. Владимир Шаков не сумел претворить желаемое в действительное. После удара форварда мяч разминулся с воротами. Гости не стали отсиживаться в обороне. Проход по флангу, перевод мяча к воротам — и уже Сергей Берг вступает в игру.

Затем наступает время атак слонимчан. Удары с разных дистанций наносят Владимир Шаков, Максим Гречиха, Михаил Щербаков, Евгений Снопко, но на пути «пятнистого» встаёт вратарь «Берёзы» Максим Хутко.

Гости сумели реабилитироваться на 37-й минуте. На подступах к штрафной площади они получили право на исполнение стандартного положения. Мяч проследовал на голову Арсению Бондаренко. Он не промахнулся.

Остался вопрос открытым: кто опекал соперника, который находился в одиночестве и нанёс победный удар?

После антракта гости заиграли куда лучше. Они раз за разом проникали к воротам хозяев. И только их спешка и расточительность помешала увеличить счёт.

А что же ФК «Слоним»? Хозяева не смирились с положением на поле, но и атаковать острее не стали, за исключением ударов Владимира Шакова, когда мяч отражала стойка ворот.

Егор ЖИГАЛИК

Результаты 27-го тура:
Слоним — Берёза — 0:1
Звезда (Минск) — Сморгонь — 1:4
Ислочь (Минский р-н) — Смолевичи — 3:2
Кобрин — Орша — 1:1
Городея — Химик (Светлогорск) — 1:1
Днепр (Могилёв) — Лида — 1:2
Барановичи — Речица — 0:0
Гомельжелдортранс — Крумкачы (Минск) — 3:3

ЧЕМПИОНАТ ГРОДНЕНСКОЙ ОБЛАСТИ ПО ФУТБОЛУ. ФИНАЛЬНЫЙ ЭТАП

СЛАБАЯ РЕАЛИЗАЦИЯ ГОЛЕВЫХ МОМЕНТОВ — И ПОРАЖЕНИЕ

«СЛОНИМ СИТИ» — «СМЕНА» (ВОЛКОВЫСК) — 0:3 (0:2)
25 октября. г. Слоним.
Стадион «Газпром трансгаз Беларусь», 30 зрителей.
Судья — А. Надиевский (Гродно)
Голы: 0:1 — 6; 0:2 — 14; 0:3 — 84.
«Слоним Сити»: Рупшис С. — Куцко, Шикуть, Лойко, Мочалов, Дегиль (Берг Влад), Молчанов (к) (Ляшевич, 74), Мандрык, Спасюк, Нагорный (Емельянчик, 80), Берг Виктор.
Тренер — Руслан Корнев.

Последний матч чемпионата для обеих команд носил товарищеский характер, так как медали были разыграны без их участия.

Игровое настроение было на порядок лучше у гостей. Хозяева дважды упустили моменты открыть счёт, чем незамедлительно воспользовались волковычане.

В обоих эпизодах они исправили ошибки обороны и в первой четверти часа игры вели в счёте 0:2. Слонимчане попытались огрызнуться, но вот беда — моменты транжировались с лёгкостью.

После перерыва игра перешла на половину гостей. Авторы в завершении атак не менялись. Удары Дениса Куцко, Виктора Берга, Александра Нагорного наносились по воротам, но гола так и не дождались.

В концовке игры гости провели контратаку, и им сопутствовал успех.

Егор ЖИГАЛИК

АФИША СПОРТИВНОЙ НЕДЕЛИ

31 октября

Футбол. Юношеское первенство Беларуси среди футболистов 1998 и 2000 годов рождения. ФК «Слоним» — ФК «Берёза». Стадион «Газпром трансгаз Беларусь». Начало в 14.00 и 16.00.

Егор ЖИГАЛИК

АНОНС

ПРЫХОДЗЬЦЕ Ў МУЗЕЙ І ТРАПІЦЕ Ў КАЗКУ



На другім паверсе Дзятлаўскага краязнаўчага музея адкрылася выстава пад назвай «Папараць-кветка — кветка Беларусі». Яе наладзіла Таццяна Трушына з Беларускага нацыянальнага тэхнічнага універсітэта, а дакладней — з аддзела беларускай народнай творчасці этна-культурнага аб`яднання «Берагіня».

Колькі тут дзівосных лялек! Мужчыны і жанчыны ў беларускіх нацыянальных строях — работы пад назва «Святочныя» і «Папараць-кветка. А які цудоўны «Жыцень» — дзед са снапом збожжа і многае іншае.

На выставе прадстаўлены таксама і расейскія лялькі.

КРЫМІНАЛ

ПЕДАФІЛ У ІЗАЛЯТАРЫ

Не так даўно жыхары Дзятлава былі ў вялікай трывозе. Суботняй раніцай на дзяўчынку-шасцікласніцу напаў педафіл.

Яна ішла ў школу займацца музыкай, і на сцяжынцы, што пралягае ля рачулкі Дзятлаўкі, напаткала зламысніка. Мужчына папрасіў дапамагчы яму адшукаць кацяня, якое нібыта тут згубілася. Калі дзяўчынка даверліва згадзілася, напаў на яе.

Дзякуючы нераўнадушным людзям, а таксама зладжаным дзеянням супрацоўнікаў міліцыі, педафіл затрыманы і знаходзіцца ў міліцэйскім ізалятары.

Высветлілася, што гэта не адзіная яго спроба здзейсніць падобнае злачынства. Такім жа чынам у пачатку верасня ён спрабаваў падманула дзяўчынку на вуліцы Фогеля ў райцэнтры, а таксама пакінуў свой след у Гродне. Цяпер яму давядзецца адказваць перад судом за ўсе свае ўчынкі.

РОДНАЕ

РУЧАІНКІ

Гэта, канешне, недарэчна, што нашы дзеці, як і пераважная большасць дарослых, не ведаюць роднай мовы. Таму вельмі радасна, што ў Дзятлаўскім дзіцячым садку №2 ёсць беларускамоўная група.



Дзеткі беларускамоўнай групы са сваёй выхавацелькай

Дваццаць пяць хлопчыкаў і дзяўчынак, якія на наступную восень пойдуць у школу, ужо другі год па спецыяльнай праграме вывучаюць родную мову. Не сакрэт, што для іх гэта складана, бо і дома, і ўсе наўкола пастаянна ўжываюць мову суседняй дзяржавы, але выхавальніца — мілая і добрая Наталля Іванаўна Кучынская — кумір для дзетак. Яна настойліва вядзе іх па сцяжынцы ведаў, дзень за днём адкрываючы чароўнае гучанне беларускай мовы.

—Мы кожны тыдзень карыстаемся роднай мовай і ў час заняткаў, і на прагулцы,— кажа Наталля Іванаўна. — Адзін раз у тыдзень праводзім заняткі пад назвай «Развіццё беларускага маўлення». На працягу дня ў групе гучыць родная мова, і толькі яна.

Каб зацікавіць дзетак, выхавальніца развучвае з імі беларускія прыказкі, прымаўкі, чытае казкі, вершы, у час гульні карыстаецца лічылкамі на роднай мове. Усё робіцца з мэтай навучыць дзетак роднаму слову, зацікавіць іх, паказаць харавство і мілагучнасць мовы продкаў.

Канешне, толку будзе няшмат, калі хлопчыкі і дзяўчынкі будуць вывучаць мову толькі ў садку, таму выхавальніца зацікаўлівае і бацькоў. Напрыклад, нядаўна прайшло свята пад назвай «Восеньскі кірмаш», у якім прынялі актыўны ўдзел мамы і таты. Мама Мішы Бойка Вольга Васільеўна была гаспадыняй свята — Восенню. На «кірмашы» гучалі беларускія песні, вершы, дзеці танцавалі «Беларускую польку».



Наталля Іванаўна Кучынская

Да свята малыя разам з бацькамі зрабілі з прыроднага матэрыялу розныя вырабы і вельмі ганарыліся гэтым. Калі паказвалі і расказвалі кожны пра сваё, вочкі свяціліся радасцю. Колькі фантазіі, колькі крапатлівай працы! Было падкрэслена, што гэта агародніна, садавіна, кветкі, грыбы і іншае вырасла на нашай такой багатай, такой прыгожай зямлі. Тут і вожык, на калючкі якога наколаты чырвоныя ягады шыпшыны, і звяркі са сланечнікавых семачак, пладоў каштана і шмат чаго яшчэ. Даша Семянюк паказала свае работы «Восеньскія дары». У прыгожым кошычку — грыбок, вінаград, яблыкі, грушы. Усё з густам аформлена.

У садок на розныя мерапрыемствы пастаянна прыходзяць бацькі. Нядаўна мамы ў нацыянальных касцюмах пагулялі з дзеткамі ў беларускія гульні. Так, мама Паліны Палуносік Таццяна Вячаславаўна ведае шмат такіх гульняў, чаму і навучыла выхаванцаў групы.

Вельмі цікава праходзяць сустрэчы з супрацоўнікамі Дзятлаўскай дзіцячай бібліятэкі (яны тут частыя госці). Шмат цікавага даведаліся хлопчыкі і дзяўчынкі з гутаркі «Беларусь — мая краіна», якая прайшла нядаўна. Бібліятэкары расказалі пра новыя дзіцячыя кнігі беларускіх аўтараў, пагулялі з малечай у розныя гульні, апранулі дзетак у беларускія нацыянальныя касцюмы.

У Дзятлаўскім краязнаўчым музеі праводзяцца тэматычныя выставы спецыяльна для дзяцей. Там таксама гучыць роднае слова.

Вялікае значэнне для навучання роднай мове, пазнання роднага горада маюць тэматычныя экскурсіі. Дзеткі не проста ходзяць і разглядваюць будынкі, якія маюць гістарычнае значэнне, але і слухаюць аповед пра іх на роднай мове.

Выхаванцы беларускамоўнай групы ўжо і самі прапагандуюць роднае слова: ходзяць у малодшыя групы і расказваюць казкі на роднай мове, гуляюць з меншымі дзецьмі ў гульні, паказваюць невялічкія пастаноўкі.

Як ручаінкі зліваюцца ў рэкі, так і родныя словы ў вуснах гэтых дзетак зліваюцца ў светлую, непаўторную, мілагучную беларускую мову. Верыцца, што з цягам часу ёй будуць карыстацца ўсе беларусы, і мова будзе жыць вечна, як і наша святая зямля.

НА ЖЫЦЦЁВЫХ СКРЫЖАВАННЯХ

ЗЯЛЁНАЯ СУКЕНКА

Сонца толькі што ўзышло, а Маня Ахламінская з вёскі Кудзераўцы ўжо была на нагах. Яна даўно на пенсіі, з усёй гаспадаркі засталося ўсяго пяць курыц, але звычка ўставаць раней за ўсіх стала другой натурай. Некалі і Міхася свайго з пасцелі падымала ні свет ні зара і прымушала працаваць. Чалавек быў хворы на сухоты, але хіба Маня пашкадуе? Ганяла, пакуль не загнала. І сама душылася ў рабоце, бо вельмі сквапная і зайздрослівая. Цяпер адна жыве ў старой хаце. Сын жыве ў Расіі, ажно ля Байкала. Прыязджае раз у пяць гадоў і то на які тыдзень.



З пасцелі цяпер Маню падымае не патрэба працаваць, а патрэба назіраць, чым займаюцца суседзі. Яна ведае, у каго які даход, дзе чые дзеці і як яны жывуць, хто што купіў або прадаў. Гэта ў яе хобі такое цяпер. А найбольш цікуе за Альбінай Міранавіч, хата якой насупроць, лічы, вокны ў вокны. Альбіна таксама жыве адна. Муж шмат гадоў назад разбіўся на матацыкле, калі ехаў ад каханкі. Пра гэта ведае ўся вёска, бо Маня дапільнавала і ўсім расказала. Нейкі час Альбіна не віталася з суседкай, бо, маўляў, напляткарыла, але ж сэрца не камень. Адпусціла.

Міранвічы былі бяздзетныя і, на думку Мані, нейкія пустадомкі. Не збіралі грошай у панчоху, а любілі хораша апранууцца, смачна з`есці. Застаўшыся адна, Альбіна таксама над капейкай не трэслася. Прыбіралася, нібы якая гараджанка. А перад кім тут фарсіць? І Ахламінская падумала, што суседка хоча зноў выйсці замуж, прываражвае нейкага мужчыну. Яна ўдвоіла пільнасць. Вось і ў гэту раніцу ў яе быў вялікі клопат. Учора акурат перад заходам сонца ўбачыла, як у двор да суседкі зайшоў нейкі чалавек. Яшчэ не такі і стары — гадоў пад шэсцьдзясят, недзе ў Маніных ды ў яе, Альбініных гадах, бо яны ж равесніцы. І пасля ў суседчынай хаце доўга гарэла святло. Маня нават канкрэтна ведае — яго выключылі ў палове трэцяй ночы.

І сама ж не спала. А сёння трэба было дапільнаваць, калі той мужчына выберацца з хаты. Пэўна ж, марудзіць не будзе, пойдзе, пакуль вёска спіць.

Яна запальвала газавую пліту, каб згатаваць снядание, і адным вокам цікавала ў акно. І праўда, той чалавек з сумкай выйшаў з варот і накіраваўся на шашу, што прабягае непадалёку ад вёскі і дзе аўтобусны прыпынак.

—Жанаты недзе, таму і ўцякае раненька. Ад жонкі збег і баіцца, каб хто не ўбачыў. Ды ад мяне не схаваешся! Усе Альбіну лічаць такой добранькай, так бы мовіць, белай ды пушыстай, а мяне злючкай і пляткаркай. Вядома, яна настаўніцай працавала, а я цялятам хвасты круціла на калгаснай ферме, то які ў мяне можа быць аўтарытэт? Але ж да мяне не ходзяць чужыя мужы начаваць.

Маня проста не магла дачакацца, калі па вясковай вуліцы праедзе аўталаўка. Убачыўшы яе, схапіла раней прыгатаваны цэлафанавы пакет з кашальком і пашыбавала да хаты Міхася Кронкі, дзе заўсёды аўталаўка спынялася. Разагналася было ды спахапілася, затармазіла. Разважыла: чаго перціся, пакуль там няма людзей? Трэба, каб сабраліся, і тады скажа сваю навіну. Плялася нага за нагу, а калі ўбачыла, што вяскоўцы падыходзяць, прыспешыла крок.

—От жа некаторыя сорам страцілі на старасці гадоў! — пусцілася ў разважанні. — Сёння ў Альбіны Міранавічыхі каханак начаваў. Усю ноч там прабыў, а раненька ледзь не подбегам паімчаў да шашы. Сама бачыла!

— А, можа, ён, цётка, дравы пераблытаў, ішоў да цябе, а трапіў да суседкі? Вось табе цяпер і крыўдна,— падміргнуў бабам Коля Вірскі, які жыў бабылём на другім канцы вёскі і ўсякі раз прыходзіў да аўталаўкі па віно.

—Ідзі праспіся, абармот! — незалюбіла Маня. Бабы маўчалі, і толькі Маніна сястра Казя сыкнула на яе:

—Усё ты бачыш! А калі такое і было, то прамаўчала б!

—А як жа, прамаўчыць! Язык у яе доўгі, у роце не змяшчаецца,— зноў уткнуў свае пяць грошай Коля.

Маня ішла ад аўталаўкі злая на ўсіх. Яна была ўпэўнена, што зславіла суседку на дрэнным учынку і вырашыла шукаць пацверджанне сваёй здагадцы.

Чакаць доўга не прыйшлося.Назаўтра была субота, і Альбіна паехала ў райцэнтр на кірмаш ды ў магазіны. Вярнулася пасля абеду, і недзе праз гадзіну павесіла на шнур, на якім у двары сушыла бялізну, памытую зялёную сукенку.

—Ага, каралеўна! — зларадна падумала Маня.— Абноўку сабе купіла, каб кавалера яшчэ больш прываражыць. І яны мне будуць казаць, што ўсё гэта так сабе.

А сукенка была прыгожая. Нават не зялёная, а нейкая аксамітная, нібы майская траўка. Вісела яна да самага вечара, мусіць, гаспадыня забылася зняць, не прыдала значэння, што летам жа высыхае хутка.

—А я здыму! — раптам стукнула ў галаву думка. — Насіць, канешне, не буду, бо здагадаецца, што ўкрала. Няхай пашукае, няхай падазрае ўсіх у вёсцы, такіх добранькіх сваіх заступнікаў.

Упоцемку яна пракралася ў двор, і, сарваўшы са шнура суседчыну абноўку, скруціла і панесла ў хату. Абы як кінула на вяроўку ў запечку, дзе віселі яе лахманы. Сюды ніхто чужы не заходзіць, таму не баялася, што ўбачаць.

Назаўтра раніцай Маня ледзь узвалаклася з ложка пакарміць курэй. Моцна балела галава. Памерала ціск: ён быў павышаны.

—Што ж мне цяпер рабіць?! Трэба тэрмінова калоць уколы, што доктар з раённай паліклінікі прыпісаў, а фельчарка Антонаўна з ФАПа ўжо другі тыдзень у водпуску, — не на жарты ўстрывожылася кабета.— У райцэнтр не наездзішся. Уколы ўмее даваць Альбіна, ды, напэўна, не пойдзе, напэўна, злая на мяне...

Але выйсця не было, і Маня, набраўшыся храбрасці, пазваніла суседцы:

—Памажы, Альбіначка! Ціск высокі, трэба калоць уколы, а няма каму.

—А ты ведаеш якія?

—Ведаю, я іх купіла. І шпрыцы ёсць.

Не мінула і пяці хвілін, як Альбіна ўжо была ў хаце. Яна прайшла ў запечак, дзе стаяў гаспадынін ложак, і на якім тая ляжала. І толькі калі Альбіна набрала ў шпрыц лекі, Маня ўбачыла на вяроўцы крадзеную зялёную сукенку. Пакрылася халодным потам, сэрца затрапяталася як заечы хвост.

А Міранвічыха, нібыта нічога не заўважаючы, зрабіла ўкол, села на край пасцелі, нейкі час памаўчала.

—Ну, ці лягчэй жа? — спытала са спагадай.

—Пагана мне, Альбінка! Цяпер ужо не ад ціску, а ад паскудства, якое табе ўчыняла... І пра чалавека выдумала, што ён твой каханец, ды потым людзі сказалі: швагер з Варкуты быў праездам. І сукенку, во, украла... Даруй...

—А я і не крыўдую,— усміхнулася Альбіна. — Ведаю, што і навыдумляла і што ўкрала. Гэта ўсё ад адзіноты і ад старэчай нудоты. Трэба ж нечым сябе заняць, вось ты і знайшла занятак... Паляжы сёння, нічога не рабі, а я вечарам зайду, яшчэ ўкол дам.

З гэтымі словамі Альбіна ступіла за парог, а шчокі Мані палымнелі ранішняй зарой. Так сорамна, як цяпер, ёй не было ні разу ў жыцці...

ПРОИСШЕСТВИЕ

ВОТ ТАК ПОХУЛИГАНИЛ

В Дятлово на улице Новогрудской 46-летний мужчина, хорошо зарядившись алкоголем, вдруг набросился на припаркованные автомобили «Ауди» и «Мицубиси» и стал их бить руками и ногами.

Как сообщает УВД Гродненского облисполкома, хулиган повредил два автомобиля. В отношении его возбуждено уголовное дело.

Анна ВОЛОДАЩУК

ДУХОЎНАЕ

У НАС БЫЛІ МІСІЯНЕРЫ



Місіянерскі крыж у дварах касцёла

На працягу тыдня маладыя ксяндзы-місіянеры Валерый і Андрэй (адзін з Гродна, а другі з Бераставіцы) праводзілі імшу ў Дзятлаўскім касцёле.

Ксяндзы не толькі вучылі прыхаджан маліцца Богу, але і расказвалі пра рэлігію, дабрыню, спагаду, міласэрнасць. Потым разам з прыхаджанамі на касцельным двары ўстанавілі місіянерскі крыж. Цяпер вернікі кожны дзень прыходзяць да яго памаліцца, папрасіць ва Усявышняга здароўя і блаславення на ўсе добрыя справы.

Вялікую дапамогу і падтрымку місіянерам аказаў Дзятлаўскі ксёндз Здзіслаў.

Уласны карэспандэнт «ГС» на Дзятлаўшчыне
Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ
Фота аўтара
Адрас: 231471, г. Дзятлава, а/я 31
Email: 375299518893@yandex.by



ВЕСТКІ З МАСТОЎШЧЫНЫ

СЯМ`Я З ГУДЗЕВІЧ — ТРЭЦЯЯ Ў РЭСПУБЛІЦЫ

У мінулыя выхадныя ў Гродне адбыўся рэспубліканскі конкурс «Уладар вёскі». Ён стаў традыцыйным і праводзіцца з 2007 года. Заснавальнікамі яго з`яўляюцца Міністэрствы адукацыі ды сельскай гаспадаркі і харчавання, «Белаграпрамбанк», Беларускі саюз жанчын.


Ваду насіў гаспадар


Кухарскія высілкі


Калолі дровы спрытна мужыкі

Гродна заваявала права на правядзенне гэтага форуму, дзякуючы перамозе на ім у мінулым годзе Дзмітрыя і Алены Скорб з аграгарадка Дзембрава Шчучынскага раёна. Па ўмовах конкурсу, адна сям`я прадстаўляе сваю вобласць.

На гэты раз гонар Гарадзеншчыны адстойвала сям`я Андрэя і Вікторыі Палойка з вёскі Гудзевічы Мастоўскага раёна са сваімі дзецьмі: дачкой Аленай і сынам Андрэем.

Андрэй працуе намеснікам дырэктара па ідэалагічнай працы ЗАТ «Гудзевічы», Вікторыя — педагог-псіхолаг у Лунненскай сярэдняй школе.

Удзельнікаў конкурсу суправаджалі групы падтрымкі з усіх рэгіёнаў Беларусі. Журы ўзначаліў першы намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Іван Жук.

Самы першы конкурс — прадстаўленне сям`і — прайшоў у моладзевым цэнтры «Гродна». Затым удзельнікі пераехалі ў «Гарадзенскі маёнтак «Каробчыцы», дзе працягнуліся спаборніцтвы. Першай справай удзельнікі конкурсу арганізавалі свае падвор`і і запрасілі туды журы.

Андрэй і Вікторыя сустракалі гасцей у нацыянальных даматканых касцюмах, якія па ўмовах конкурсу павінны адлюстроўваць асаблівасці свайго рэгіёна. У гэтым плане Палойкам дапамаглі супрацоўнікі Гудзевіцкага дзяржаўнага музея, дзе працуе ткацкі гурток.


І каня запрэгчы патрэбна было ўмець

Пасля Вікторыя паказала свае кулінарныя здольнасці: ад фірменных страў да закатак. Надалей пайшлі конкурсы, звязаныя з вясковым жыццём: запрэгчы і распрэгчы каня, эстафета «За дровамі», падчас якой удзельнікам неабходна было распілаваць бервяно, наналоць дроў і скласці іх. З дровамі і канём Палойкі справіліся паспяхова, у чым ім дапамагала група падтрымкі.

Па выніках спаборніцтваў мастаўляне занялі трэцяе месца. На другім месцы — сям`я Рамановічаў з Віцебскай вобласці. Галоўны прыз спаборніцтваў — мотаблок — дастаўся пераможцу конкурсу сям`і Стругавец з Магілёўскай вобласці.

Усіх удзельнікаў конкурсу чакалі дыпломы і грашовыя прызы ў 80 базавых адзінак, а таксама маразільнікі і веласіпеды.

Язэп ПАЛУБЯТКА
Фота з архіва аўтара

ПОГЛЯД

ПРА АДНУ АДМЕТНАСЦЬ МАСТОЎ

Кожны населены пункт мае сваю адметнасць, сваю візітоўку. Не застаюцца ў баку ад гэтага і Масты. Калі хтосьці палічыў, што ніжэй пойдзе гутарка пра самы доўгі падвясны мост у Беларусі, які знаходзіцца ў Мастах, то памыляецца. Ён — бясспрэчна візітовая картка горада, але...

Агулам у Мастах ёсць тры асаблівыя з`явы, якія выдзяляюць яго сярод іншых населеных пунктаў. Да тутэйшых асаблівасцей можна аднесці колькасць цырульняў, крамаў будаўнічых матэрыялаў і «ляжачых паліцэйскіх».

Наконт апошняга — ні адзіны населены пункт Беларусі не пераскача, не пераплюне ў гэтым плане Масты. Першыя «ляжачыя паліцэйскія» ў Мастах з`явіліся ў 2000 годзе. Тады летам, калі школьнікі былі на вакацыях, на вуліцы Цэткін, дзе знаходзіцца СШ №5, быў збіты аўто юнак, які ехаў на ровары.

ДАІ адрэагавала адразу. Паклалі на пераходзе «спячых паліцэйскіх». Ніякага аналага ім не адшукаць у свеце. Машыны з нізкаю пасадкай завісалі на іх. Пратэсты кіроўцаў, што завісалі на «пузе тых спячых паліцэйскіх», супрацоўнікі Мастоўскай ДАІ не прымалі да ўвагі. Толькі пасля таго, як тут завіс на ўласным аўто адзін з тых, хто мае права даваць дазвол на ўстаноўку падобных аб`ектаў, «паліцэйскага» там крыху зрэзалі, але імпэт для ўстаноўкі «ляжачых паліцэйскіх» у мастоўскай улады павялічыўся. Уладу панесла.


«Спячы паліцэйскі» ў Лунна

«Спячыя паліцэйскія» сталі ўзнікаць, дзе трэба, але ў большасці — дзе не трэба. Вось таму прыклады.

Вуліца Гастэла на ўскрайку горада. Каля дзясятка дамоў з аднаго боку. Аўтамабільнага руху амаль ніякага, тым больш пешаходнага. На яе скрыжаванні з вуліцай Багдана Хмяльніцкага леглі нікому непатрэбныя «паліцэйскія».

Праз 50 метраў — вуліца Якуба Коласа. Пешаходны рух там інтэнсіўны, бо жыхарам мікрараёна наўпрост патрэбна трапіць у цэнтр горада, на працу на «Мастоўдрэў». Але тут рух аўтамабіляў «ляжачымі паліцэйскімі» не прыпынілі. Нават да апошняга часу не было пазначанага пешаходнага перахода.


Далей — скрыжаванне вуліц Хмяльніцкага і Матросава. Па апошняй вуліцы амаль ніякага пешаходнага і аўтамабільнага руху няма. Тым не менш, «паліцэйскі» ёсць. Ёсць ён і на скрыжаванні вуліц 30 гадоў ВЛКСМ і Палявой. 30 гадоў ВЛКСМ выконвае ролю аб`язной, а Палявая — другарадная, але перад ёю патрэбна спыняць рух вялікагрузных аўто.

Дзясяткі «ляжачых паліцэйскіх» у горадзе. Але іх пастаноўкай у Мастах улады не абмяжоўваюцца. Арыгінальны падыход па ўстаноўцы «ляжачага паліцэйскага» можна назіраць у мястэчку Лунна. Напачатку «паліцэйскага» там усталявалі акурат на шасэйным палатне. Вадзіцелі, каб не біць падвеску сталі спрабаваць аб`язджаць яго. Гэта не засталося незаўважаным ДАІстамі, і хутка той хіб ліквідавалі (глядзіце фота).

Язэп ПАЛУБЯТКА
Фота з архіва аўтара

НАРЫС

НЕВЯДОМЫ ВЯДОМЫ ХВЕДАР НЮНЬКА І АЛЕШАВІЧЫ



Хведар Нюнька

Першы за гэты год у нашых мясцінах дождж. Восеньскі. Спакойны ды спрытны. Думаю, наведаю вёску Алешавічы, што зараз у межах Мастоўскага раёна. Вёска выміраючая, але яе гісторыя і жыццяпіс яе насельнікаў варты не адной кнігі.

Алешавічы — уласнасць знакамітага роду яшчэ часоў ВКЛ Незабытоўскіх. Апошні міністр сельскай гаспадаркі перадваеннай Польшчы паходзіў адсюль. Толькі гутарка пра Незабытоўскіх пазней. Я ў гэты дзень прыехаў на радзіму Хведара Нюнькі — знакамітага беларуса Літвы і малавядомага на Беларусі, і зусім невядомага ў вёсцы, дзе нарадзіўся.

З гісторыі жыцця сям`і Нюнькаў

Як сведчаць даведнікі, Хведар Нюнька — беларускі грамадска-культурны дзеяч у Летуве. Ад утварэння 4 лютага 1989 года да 29 верасня 2014 года — старшыня Таварыства беларускай культуры ў Летуве. Сябра Рады Беларускай Народнай Рэспублікі з 1997 года.

Больш падрабязна пра сябе Хведар Нюнька распавядае ў аўтабіяграфічнай кнізе «Мае ўспаміны». Нарадзіўся ён ці то 5 сакавіка, ці то 6 красавіка 1928 года ў вёсцы Алешавічы, што тады належала да гміны Каменка Шчучынскага павета. Пражыў тут дзесьці з год. Непадалёку на стыку Нёмана і Зальвянкі браты Канапацкія пачалі будаваць дыхтавую фабрыку. Дыхта прызначалася для пабудовы самалётаў і таму была запатрабавана ў свеце. Вытворчасці патрэбны былі рабочыя рукі і прадпрымальнікі, таму ўсім, хто пераселяўся сюды жыць, стваралі спрыяльныя ўмовы. Неўзабаве сям`я Нюнькаў пераехала ў рабочы пасёлак Масты Фабрычныя. Аднак бацька Якуб не пайшоў працаваць на фабрыку, а заняўся камерцыяй. З братам Язэпам непадалёку ад завода збудаваў дом, у раёне цяперашняга Дома тэхнікі. Пазычыў грошы і ў адным з пакояў адчыніў краму. Разлік быў правільны, бо рабочым былі патрэбныя тавары першай неабходнасці. Соль, крупы, газа, запалкі і іншае карысталіся попытам. Крама стала даваць добры прыбытак, аб тым сведчыць тое, што неўзабаве быў набыты матаровар «Закс» ды радыё. На тым мапедзе яны з бацькам наведваліся ў Алешавічы. Аднак неўзабаве ўзніклі непаразуменні з Канапацкімі. Узніклі з-за таго, што заводскі бухгалтар, папросту кажучы, прапіў заводскую касу. Грошы тыя аселі ў гандэлку Якуба Нюнькі. Заводчыкі зрабілі ўсё, каб іх крама збанкрутавала. У 1936 годзе сям`я пераязджае ў Шчучын, дзе бацька адчыняе зноў краму. З прыходам новай улады ў 1939 годзе камерцыя Нюнькі не давала прыбытку, а яго высылцы ў Сібір як «непрацоўнага элемента» пamяшала новая вайна.

Пачатак той вайны Хведар сустрэў у Алешавічах у дзеда. Тым ранкам ён пасвіў каня. Бачыў, як над Шчучынам — наўпрост 8 кіламетраў — стаяў дым ад пажараў. Немцы бамбілі аэрадром, што знаходзіўся тут. Быў сведкам, як нямецкія самалёты збілі савецкі. Лётчык застаўся жыць і пайшоў да чырвонаармейцаў, што размяшчаліся ў панскім маёнтку. Неўзабаве чырвонаармейцы загадалі вяскоўцам пакінуць дамы, бо збіраліся знішчыць склад з боеприпасамі. Хлопчык быў з канём за некалькі кіламетраў ад вёскі. Бачыў, як рваліся снарады, гарэў панскі маёнтак. Ад выбухаў пачалі гарэць дамы ў вёсцы. Яна амаль уся выгарала. Згарэла і дзедава хата. Неўзабаве дзед з сынамі адбудавалі яе нанава. Адбудавалі ўжо другі раз. Першы раз тое было ў дваццатыя гады, калі вярнуліся з Расіі з бежанства, дзе дзед з сям`ёю пражылі шэсць гадоў.

У Шчучыне сям`я пражыла да 1943 года. Некалькі разоў тут паўставала рэальная пагроза расстрэлу немцамі бацькі, але пазбегнуць таго памагала веданне Хведарам нямецкай мовы. Надалей жыццё Хведара звязана з Літвой і Вільняй. Тут ён набывае адукацыю — расейскую гімназію канчае ў 1948 годзе і ў 1953-м — лясны факультэт Літоўскай сельгасакадэміі. Затым была праца ў праектных будаўнічых інстытутах Вільні. Занятак грамадскай дзейнасцю быў нечаканым для яго самога.

Шлях да беларускасці

У 1988 годзе яго сябра беларус Юрый Зімніцкі запрасіў на вечарыну ў палац прафсаюзаў. У ёй прымалі ўдзел бард Сяргей Сокалаў-Воюш, Вінцук Вячорка і іншыя мінчукі, што спрычыніліся да беларускага адраджэння новай хвалі. Успаміны вярнулі яго ў 1942 год, калі ў Шчучыне ён навучаўся ў беларускамоўнай школе. Пасля той сустрэчы Хведар Нюнька далучаецца да працы клуба віленскіх беларусаў «Сябрына». Грамадская праца захапіла. Ужо ў наступным годзе Нюнька стварае Таварыства беларускай культуры і становіцца яго кіраўніком. Арганізацыя набыла папулярнасць сярод беларусаў ад Аўстраліі да Канады, займела добрыя стасункі з мясцовымі ўладамі. Пералік здзейсненага арганізацыяй і яе кіраўніком займе шмат часу, таму я хачу звярнуцца да тых момантаў жыцця Хведара Нюнькі, якія не асвятлялі журналісты.

Нашы сустрэчы

Першае кароткае наша знаёмства адбылося ў палове 90-х гадоў мінулага стагоддзя. Ён тады наведаў родную вёску ды сустрэўся з мастоўскімі актывістамі ТБМ. З адным з іх Хведар прыехаў да мяне дамоў. Ён падарыў мне некалькі беларускіх кніг, што выйшлі ў Вільні, мы абмяняліся кантактамі. Памятаю яго тады: постаці невысокай, хударлявы, з выключна тутэйшай гаворкаю.

Другая сустрэча была больш працяглая. Адбылася яна падчас З`езда беларусаў свету, што праходзіў у тэатры музычнай камедыі ў Мінску. Адразу было бачна, што Хведар Нюнька — постаць вядомая. Да яго пастаянна падыходзілі дэлегаты і госці з`езда. Ён, як толькі заўважыў мяне, падышоў сам. Абгаварылі шмат чаго, але на маё пытанне, калі ён будзе на радзіме, адказу я не пачуў.



Такога ліня злавіў на возеры ў Алешавічах

Палівае восеньскі дождж, а я іду па вёсцы ў адну вуліцу і разважаю. Вядома, што дзед у той няпросты час не мог мець сталага прыбытку, таму здольныя на працу сыны пайшлі ў свет. Жыў напрыканцы вёскі, дзе жыла бедната. Хоць столькі гадоў няма пана, змянілася колькасць уладаў, але вёска ўсё роўна дзеліцца на дзве паловы: прыдворныя і батракі. Дзед пахаваны на кладах ля царквы ў суседнім Яцвеску. Што сталася прычынай таго, што Хведар Нюнька не так часта наведваў сваю вёску? Невядома. Запытаю, як пабачымся пры выпадку. Калі верыць словам Франака Нюнькі, далёкага і адзінага сваяка тут, то дзеду сядзібу ён наведаў адзін раз, тое прыпадае на час першай з ім нашай сустрэчы. Дзедаў дом, вядома, не захаваўся. А яго агарод апрацоўвае Франак. Што ў Вільні жыве такі яго сваяк, Франак даведаўся пры той сустрэчы. Іншыя вяскоўцы, нават Хведаравага веку, аб ім не памятаюць.

Шмат чаго, пэўна, пра сваю радзіму пасля ад`езду ў Вільню не ведае і Хведар. Не ведае, што пасля вайны тут збудавалі пачатковую школу, клуб, лазню, валоўнік. Толькі зараз гэтага нічога няма.

Надзея на адраджэнне вёскі

Вёска выміраючая. Самаму маладому яе насельніку Аляксею Гапановічу — 30 гадоў, сям`і ён пакуль не мае.

Усё ж ёсць надзея, што вёска адновіцца, і ў яе гісторыі паўстане новая старонка. Мясцовы прадпрымальнік Уладзімір Кандратовіч побач са старым возерам мае яшчэ чатыры. Стварае зону адпачынку і рыбалкі для аматараў рыбнай лоўлі. Лавіць рыбу сюды прыязджаюць не толькі мастаўляне, але жыхары Шчучына, Гродна, Ваўкавыска, Дзятлава, Слоніма. Апошнія прыязджаюць дзвюма камандамі па тры чалавекі ўжо не адзін год і штораз на тыдзень. Едуць сюды і тыя, хто жадае мець буйны ўлоў. Скажам, карпа ў 15 кілаграм, амура ў 10 і г. д. У азёрах тут водзяцца таўсталобы, шчупакі, ліні, самы. Нават аўтар гэтых радкоў можа пахваліцца вось такім поспехам (на фота).

Язэп ПАЛУБЯТКА
Фота з архіва аўтара

СМІ ПРА СМІ

ЮБІЛЕЙ:

ГАЗЕЦЕ «БЕЛАРУС» — 65



Нумары газеты«Беларус»



На юбілеі з «Беларусам»

У нядзелю, 25 кастрычніка, свой 65-гадовы юбілей адзначала газета беларускай дыяспары ў Амерыцы — «Беларус». Першы нумар газеты выйшаў у Нью-Ёрку 20 верасня 1950 года. Залажыла выданне створанае паваеннай эміграцыяй у 1949 годзе Беларуска-Амерыканскае Задзіночанне (БАЗА).

Газета цалкам выдаецца на ахвяраванні сваіх чытачоў і рыхтуецца рэдакцыйнымі калектывамі цягам усіх гэтых гадоў на грамадскіх пачатках. Да сённяшняга часу ў свет выйшла 616 нумароў.

«Беларус» — адно з найстарэйшых перыядычных беларускіх выданняў у замежжы. Можна сказаць, што гэта сёння амаль адзіная эміграцыйная газета, якая ўтрымалася такі доўгі час. «Беларус» адлюстроўвае не толькі жыццё амерыканскіх беларусаў, але і падае інфармацыю пра беларускія асяродкі ў розных іншых краінах, а таксама і пра навіны з Бацькаўшчыны. Ад пачатку і да сённяшняга дня газета трымаецца ў сваім змесце патрыятычных поглядаў, падтрымлівае ідэю дзяржаўнай незалежнасці Беларусі, ідэі дэмакратыі і свабоды, прапаганды і абароны беларускай культуры і мовы.

Юбілейная імпрэза адбылася ў Беларускім цэнтры на Атлянтык Авэню 401 у Нью-Ёрку. Ганаровым госцем і асноўным прамоўцам быў сп. Вітаўт Кіпель.

Шмат гадоў ён супрацоўнічаў з газетаю і ўкладаў сваю працу ў яе выданне разам са сваёй жонкаю Зораю і блізкімі паплечнікамі. Сп. Кіпель зачытаў прывітальны ліст ад сп. Янкі Запрудніка, які цягам 15 гадоў быў галоўным рэдактарам, але ў гэты дзень не здолеў прыйсці на юбілей. Ад імя сваёй адданай беларускай справе вялікай сям`і сп. Вітаўт зрабіў сапраўды «царскі» падарунак газеце — ахвяраванне на 1 тысячу даляраў.



Ганаровы госць і фундатар выдання Вітаўт Кіпель быў галоўным прамоўцам на юбілеі

Сучасны галоўны рэдактар газеты сп. Ганна Сурмач зачытала атрыманыя віншаванні з юбілеем — ад сп. Івонкі Сурвіллы — старшыні Рады БНР, ад Згуртавання беларусаў свету «Бацькаўшчына», ад Згуртавання беларусаў Канады і Парафіі святога Кірылы Тураўскага з Таронта, ад сп. Валеры Барташа з Севастопаля. Яна таксама згадала гісторыю выдання, кожнага з ягоных папярэдніх галоўных рэдактараў, прадэманстравала першы нумар газеты і запрасіла прысутных азнаёміцца з падрыхтаванай у залі выставай.

Сябра рэдакцыі сп. Тацьцяна Красоўская распавяла, як даносіцца газета да чытачоў, куды ідзе рассылка, зачытала некаторыя атрыманыя лісты са словамі падзякі. Сябра рэдакцыі, які ажыццяўляе камп`ютарны набор нумароў газеты, сп. Мікола Шыдлоўскі заклікаў прысутных больш актыўна супрацоўнічаць з газетаю, падаваць свае інфармацыі, каб змест газеты стаў больш шырокім.

Расціслаў Гарошка, як адзін са старэйшых чытачоў газеты, пажадаў выданню поспехаў, каб яно працягвала жыць у будучыні.

Імпрэза скончылася ўспамінамі пра розныя адметныя моманты ў жыцці газеты, смешныя выпадкі. Так, сп. Гарошка нагадаў, як жонка аднаго з былых рэдактараў газеты цягам 20 гадоў Станіслава Станкевіча прасіла сяброў на нейкім сходзе БАЗА: «Не адбірайце ў яго газету, бо ён памрэ». Дзякуючы такім вось энтузіястам, і дажыў «Беларус» да гэтага паважнага 65-гадовага веку.

Ганна СУМРАЧ
Фота Belarusworld Baza



Удзельнікі імпрэзы



ЛЕЧЕНИЕ

ЕСЛИ РЕБЕНОК ЗАБОЛЕЛ

Даже при обычном ОРЗ ребенку нужен особый уход и режим дня. Только так малыш сможет быстро выздороветь и восстановить прежние силы. Задача родителей — сделать все, чтобы помочь малышу в этом.

Диетическое питание для ребенка, который болеет

В меню малыша должно быть достаточное количество жиров, белков, углеводов и витаминов. Однако пища должна быть привычной — любая новая еда создает дополнительную нагрузку на организм. А ребенку сейчас нужно направить все силы на выздоровление. Лучше готовить любимые продукты малыша.

Если у ребенка больное горло, не стоит предлагать ему сушки, сухари, печенье или любое другое твердое питание. Основные блюда лучше готовить без соли и специй. А если кроха просит что-то сладенькое, угостите его мармеладом или зефиром.

! Не заставляйте кроху есть, если у него нет аппетита. Тем более не настаивайте, если у него высокая температура.

! Не забывайте проверять температуру напитка. Ребенок может обжечься.

Следим за питьевым режимом

Ребенок, который заболел, должен много пить. Поступающая в организм жидкость не только предотвращает обезвоживание, но и помогает вывести вирусы и токсины.

Во время болезни ребенку нужно давать теплые напитки — простую питьевую воду, детский чай, отвар из ромашки или шиповника, ягодные морсы. Выясните, что из этого крохе нравится больше всего, и давайте ему напиток как можно чаще.



Обязательно соблюдайте рекомендации врача по приему лекарств. Некоторые лучше усваиваются организм, если принимать их натощак. Другие лучше принимать во время еды.

А чай из малинового варенья поможет снять жар и улучшить отхождение мокроты. Но не стоит забывать, что напиток может вызывать аллергию.

Проветриваем помещение, в котором находится ребенок, часто

Болеющий ребенок нуждается в чистом свежем воздухе. Поэтому проветривайте помещение, в котором он находится, как можно чаще. При этом ребенка лучше выводить из комнаты.

Угощайте малыша кисломолочными продуктами. Они восстанавливают кишечную микрофлору и укрепляют ослабленный иммунитет.

Регулярно (1 или 2 раза в день) выполняйте влажную уборку. В такой комнате будет легче дышаться. А если состояние малыша и погода позволяют, 2-3 раза в день выходите на прогулку.

И не забывайте выполнять все, что назначил доктор (массаж, промывание носа и т.д.).

Режим и регулярность процедур помогут вашему малышу побыстрее поправиться!

ПРОФИЛАКТИКА

КАК ПОДГОТОВИТЬ ИММУНИТЕТ МАЛЫША К СЕЗОНУ ПРОСТУД?

Одни малыши болеют всеми возможными болезнями, другие даже в самый разгар сезонных эпидемий ни разу не чихнут. «Такой иммунитет», — вздыхают родители. Отчего он зависит и можно ли его укрепить?

Во многом работа детской иммунной системы зависит от того, какая наследственность досталась ребенку, как протекала беременность, были ли осложнения, как долго малыш находился на грудном вскармливании, нет ли у него аллергии, насколько чувствительна и возбудима его нервная система.



Впрочем, не стоит все списывать на внешние факторы. Огромное значение имеет и то, в каких условиях вы живете, какая экологическая обстановка в вашем регионе, как питается малыш.

Подтачивают защиту организма и хронические очаги инфекций, недостаток витаминов и минералов.

Следите за тем, какую воду пьет ребенок.

Важно. Прием антибиотиков ослабляет иммунитет организма на 50-70% процентов. Антибактериальные препараты уничтожают не только болезнетворные бактерии, но и полезную микрофлору, которая обеспечивает защиту.

! Следует насторожиться, если при простудных заболеваниях у малыша не поднимается температура. Это верный сигнал о снижении иммунной защиты организма.

Существует несколько критических периодов развития иммунной системы ребенка: до 29 дня жизни; 4-6-й месяцы; 2-й год; 6-7 лет.

Иммунитет у новорожденных и грудных детей очень несовершенный, поэтому большую роль в защите ребенка в возрасте от 6 до 12 месяцев играют грудное вскармливание и профилактика дисбактериоза.

Как понять, что у малыша снижен иммунитет?

Если вы видите, что малыш быстро утомляется, появились расстройства сна, излишняя сонливость или наоборот, бессонница, часто болит голова, постоянные простуды, ОРВИ, скорее всего, его иммунитет ослаблен.

! Сильно подрывают иммунную защиту организма большое количество маринованной пищи в детском меню, консерванты, обилие сладостей, газировок, дрожжевых продуктов и выпечки.

do3.ru

ПОЛЕЗНАЯ ВЫПЕЧКА ДЛЯ МАЛЫША

ТВОРОЖНЫЙ МАННИК

Что понадобится:
- 350 г творога;
- 3 яйца;
- 1 столовая ложка сахара;
- 1 столовая ложка манки;
- 2 чайные ложки ванильного сахара;
- 1 чайная ложка разрыхлителя;
- 3/4 стакана кефира

Как готовить:

Манную крупу заливаем кефиром, перемешиваем и оставляем на 30 минут для набухания.

Творог, сахар, ванильный сахар и яйца перемешиваем до однородности, добавляем разрыхлитель.


Соединяем творожную и манную массы, перемешиваем, пока не разобьются все комочки.

Смазываем маслом форму для выпечки, немного присыпаем манной крупой и выливаем в форму тесто. Ставим в разогретую духовку и выпекаем на протяжении 45-50 минут.

ВАРЕНЫЙ ОМЛЕТ (НА 2-3 ПОРЦИИ)

Что понадобится:
- 3 куриных яйца или 6 перепелиных яиц;
- 2/3 стакана молока;
- соль.

Как готовить:



Вилкой или миксером взбиваем яйца с солью, добавляем молоко и тщательно перемешиваем. Берем 2 чистых полиэтиленовых пакета или 2 пакета для запекания. Вкладываем один в один и наливаем в них яичную массу. Пакет завязываем так, чтобы сверху оставалось место, ведь омлет в ходе приготовления будет увеличиваться в объеме.

Опускаем пакет с яйцами в кипяток и варим около 30 минут. Достаем омлет из воды и выкладываем из пакета на тарелку.

Страницу подготовила Анна ВОЛОДАЩУК

ЗАГЛЯНЕМ У СЯМЕЙНЫ АЛЬБОМ

МАСТАЦКАЯ САМАДЗЕЙНАСЦЬ СЛОНІМСКАГА СПТВ-5

Мастацкая самадзейнасць Слонімскага СПТВ-5

Гэтыя здымкі зроблены ў 1970 годзе. Дырэктарам СПТВ-5 тады быў Д.П. Зінгер, які дбаў аб занятасці навучэнцаў і ў вольны ад вучобы час. Сваім энтузіязмам ён далучаў да мастацкай самадзейнасці як навучэнцаў, так і супрацоўнікаў вучылішча.

З канцэртамі мы ездзілі не толькі па раёне. На 30-гадовы юбілей сістэмы прафесійна-тэхнічнага навучання ў Гродна быў запрошаны і наш творчы калектыў. Гледачы і журы асабліва шчыра віталі тады харавы калектыў і вакальна-інструментальны ансамбль.

Быў створаны ў вучылішчы і духавы аркестр, які карыстаўся павагай сярод навучальных устаноў вобласці. Мне ў той час пашанцавала сустрэць Барыса Макарона і Анатоля Бяляніна — першы кіраваў гурткамі, другі быў яго паплечнікам і актыўным удзельнікам мастацкай самадзейнасці.

Мікалай ЕМЕЛЬЯНЧУК
Фота з архіва Анатоля БЯЛЯНІНА



Вакальна-інструментальны ансамбль СПТВ-5, 1970 год



Духавы аркестр Слонімскага СПТВ-5, 1970 год



Выступае харавы калектыў СПТВ-5 на 30-годдзі сістэмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі вобласці, 1970 год



ПРОСТО АНЕКДОТ

Первокласснику дали сто рублей.

— Сто рублей! Я богат! Шестикласснику дали сто рублей.

— О, сто рублей. Хоть в макдак схожу. Одиннадцатикласснику дали сто рублей.

— У, сто рублей. Разве это деньги? Студенту дали сто рублей.

— Сто рублей! Я богат!

☺ ☺ ☺

— Ты спишь?

— Да.

— А кто мне тогда отвечает?

— Кот.

☺ ☺ ☺

— У меня жена страдает от алкоголизма...

— Пьет?!

— Нет, я пью, она страдает.....

☺ ☺ ☺

Папа своей дочери (4 годика) за столом:

— Когда я ем я глух и нем. Она, посмотрев на него:

— А я нормальная...

☺ ☺ ☺

— Приезжай в гости!

— Да ну, опять нажремся.

— Ну и что?

— Умеешь ты уговаривать! Еду!

СКАНВОРД

1, 2, 3, 4 (фото)

- Спорт. клуб дяди Степы
- Напарник Петрова по Перу
- Ткань
- Озвучил почтальона Печкина
- Певец
- Стих Пушкина
- Прилавок
- Героиня А.Н. Толстого
- Озеро в Армении
- Автобан ямщика
- Фото 2
- Соль в октаве
- Чертовски тихое место
- Вышедший в финал
- Пятикнижие
- Светящийся в темноте элемент
- Греч. буква
- ъ
- Богиня времен года
- Похожее слово
- Фото 3
- Фото 4
- Осадки, губящие урожай
- Звено гусеницы
- Хит «Любэ»
- Лесть в стихах
- Крик вояки для атаки
- Самолёт Чкалова
- Фото 1
- Интернет «тусовка»
- «Чипполино», автор
- Локатор

Слово-пароль 1 2 3 4 5 6 7

РЭТРАФОТА



Слонім падчас Першай сусветнай вайны.

Спальванне моста праз Шчару пры адступленні 9-га армейскага корпуса рускай арміі ў жніўні 1915 года.

Наталля ІВАНОВА

ЛЮБИНСКИЕ — ЛЬВОВ, ПОТОМ СЛОНИМ И ЛИДА

Ищу свои корни в Беларуси. Мой прадед Мечислав Любинский (родился во Львове в 1900 году), защитник Львова, женился на Анне Любинской из деревни Юровичи (Вильно).

Дальнейших своих предков не знаю. Если у кого-то есть сведения о семье Любинских, пишите мне на электронную почту wandamagda@wp.pl

Полина ПЛЕШКО

P.S. Уважаемые читатели! Если Вы хотите найти кого-то из своих родных, друзей, знакомых, обращайтесь в нашу рубрику «Ищу тебя». Мы поместим Ваше послание на страницах «ГС», сайте издания и в соцсетях. А также обязательно пишите или звоните нам, если Вам что-то известно о людях, которых ищут в нашей рубрике: тел. 8 029 133-04-21, e-mail zhannapleshko@gmail.com

Старонку падрыхтавала Наталля ІВАНОВА

ОКОНЧАНИЕ ПЕРВОЙ ЧЕТВЕРТИ ОТМЕТИЛИ ПОХОДОМ В МУЗЕЙ



В слонимском краеведческом музее



Елена Сухорукова рассказывает детям о событиях, произошедших в Слониме во время Великой Отечественной войны



С интересом рассматривали экспонаты

Третьеклассники «Б» и «В» классов СШ №8 вместе с классными руководителями Снежаной Нагорной и Светланой Боковец, в субботу 24 октября совершили экскурсию в Слонимский краеведческий музей. Таким образом, они решили отметить окончание первой учебной четверти.

Экскурсовод Елена Сухорукова доступно и очень интересно рассказала детям о важнейших исторических вехах Слонимщины.

Ребята услышали исторические рассказы о военных событиях, произошедших в Слониме и районе, о героях этих событий и многом другом.

Школьникам были представлены разнообразные экспонаты, возле которых ребята с большим удовольствием фотографировались.

Многие предметы, находящиеся в музее, дети увидели впервые, что вызвало у них большой интерес. Экскурсия ребятам очень понравилась.

Татьяна ПЛАХЕТКО
Фото автора
Больше фото смотрите на сайте gs.by

СВОИМИ ВПЕЧАТЛЕНИЯМИ ОНИ ПОДЕЛИЛИСЬ С КОРРЕСПОНДЕНТОМ «ГС»

Аня



Экскурсия мне очень понравилась. Много всего интересного узнала. Например, имена героев, которые защищали Слоним во время войны. Много красивых экспонатов. Больше всего понравились немецкие музыкальные инструменты.

Юля




Услышала много интересных историй, которые произошли во время войны в Слониме. Запомнила имя пионера-героя — Вася Крайний. Его именем названа одна из улиц в Слониме.

Саша



Нам интересно рассказывали об Отечественной войне и о сражениях в Слониме, о партизанах и детях, которые также воевали. Я теперь знаю, почему на танке в Слониме написана цифра 107. Это дата освобождения нашего города — 10 июля.

Андрей



Очень понравились рассказы о партизанах, о молодых Слонимских героях, об освобождении Слонима. Нам рассказывали о событиях, которые проходили во время войны в нашем городе, многие из них я запомнил.

А ПРАВДА ЛИ, ЧТО...

СТРАУС ПРЯЧЕТ ГОЛОВУ В ПЕСОК?

Такое представление о страусах возникло ещё в Древнем Риме. Но долгие наблюдения людей за страусами на фермах, где этих птиц разводят, показали, что это не так.

Страусы никогда не прячут голову в песок, а лишь наклоняются к земле для того, чтобы проглотить немного песка и мелких камешков. Это нужно им, как и многим другим птицам, для улучшения пищеварения. А на случай опасности природа наделила страусов мощными ногами, на которых они очень быстро убегают.

ЗАГАДКИ С ПОДВОХОМ

1. Один курсант военного училища написал о себе следующие строки : «У меня пальцев двадцать пять на одной руке, столько же на другой, по пять пальцев на каждой ноге». Как это может быть?
2.Самый первый полупроводник в мире.
3. Бочка с водой весит 50 килограмм, что нужно добавить, чтобы она стала весить 15 килограмм?
4. Что продолжает работать после того, как его выключают?
5. Какие зубы у человека появляются последними?
6. Человек выпрыгнул из самолета без парашюта. Он приземлился на твердый грунт, но остался невредимым. Почему?

Ответы:

1.Просто курсант военного училища забыл поставить двоеточие между словами : «У меня пальцев двадцать: пять на одной руке...».
2.Иван Сусанин.
3. Отверстие.
4. Будильник.
5. Искусственные.
6. Самолет стоял на взлетной полосе.

Страницу подготовила Татьяна ПЛАХЕТКО

Намеснік галоўнага рэдактара
Мікола КАНАНОВІЧ
Журналісты
Уладзімір ШУМЕЛЬ
Яўген ВАЛАДАШЧУК
Кацярына ЯНУШЭВІЧ
Таццяна ДЗЕНІСЮК
Алена КАСЦЮК
Стыль-рэдактар
Жанна ПЛЕШКО
Рэдакцыя сайта www.gs.by
Рэдактар
Дзмітрый МІЦКЕВІЧ
Спецыяліст па рэкламе
Марыя ІЛЫЧОВА

Галоўны бухгалтар
Святлана ПРЫМАВА
Бухгалтар
Вольга БУРСЕВІЧ
Аддзел падпіскі і продажу
Аляксей НАВІЦКІ
8-(029) 322-06-42
Вёрстка і дызайн
Віталь ЕМЯЛЬЯНАЎ
Сяргей РЭКУН

Тэлефоны рэдакцыі:
т/факс: **8 (01562) 29-999,**
Тэл. 6-36-58, 6-36-68, 6-36-54, 6-36-44.
МТС: **8-029-584-87-32**
Velcom: **8-029-133-04-21**
Skype — gazslon
(9.00-18.00)
Для карэспандэнцыі:
231799, г. Слонім,
вул. Чырвонаармейская, д. 41
e-mail: gs@gs.by,
gazslon@gmail.com

Рэкламная служба
Начальнік рэкламнай службы
Ганна ВАЛАДАШЧУК
anna@gs.by
8-(029) 612-26-43
Супрацоўнікі
Наталля СТРУПАВЕЦ
Людміла КАМЯНЕЦКАЯ
Ірына ФРАНОВІЧ
8-(044) 715-90-03
8-(01562) 6-60-56
(9.00–16.00)
т/факс:
8-(01562) 29-000

Прыём аб'яў і падпіска:
г. Слонім, Чырвонаармейская, 73 Б
(будынак АРЗ)
Працуем аўторак — пятніца 9^{00}-17^{00}
субота — нядзеля 9^{00}-15^{00}
выхадны — панядзелак
8-(044) 762-48-39

погода на неделю

	утро	день	вечер
СРЕДА, 28 октября	2⁰	8⁰	6⁰
ЧЕТВЕРГ, 29 октября	2⁰	5⁰	4⁰
ПЯТНИЦА, 30 октября	0⁰	6⁰	5⁰
СУББОТА, 31 октября	0⁰	6⁰	5⁰
ВОСКРЕСЕНЬЕ, 1 ноября	0⁰	6⁰	5⁰
ПОНЕДЕЛЬНИК, 2 ноября	1⁰	8⁰	6⁰
ВТОРНИК, 3 ноября	7⁰	11⁰	4⁰
СРЕДА, 4 ноября	7⁰	11⁰	4⁰

www.meteoprog.by

СЛОНІМ НА ПАЖОЎКЛЫХ СТАРОНКАХ

ПЕРШЫ ДРУКАВАНЫ ПАРТРЭТ АНАТОЛЯ ІВЕРСА АДШУКАЎСЯ Ў ЧАСОПІСЕ «ШЛЯХ МОЛАДЗІ»

У №15 часопіса «Шлях моладзі» ад 25 жніўня 1939 года надрукаваны звесткі пра першы паэтычны зборнік «Песьні на загонах» маладога слонімскага паэта Анатоля Іверса (Івана Дарафеевіча Міско, 1912-1999) і партрэт самога аўтара. Цяпер гэты партрэт ёсць і ў Вікіпедыі.

Як піша часопіс, зборнік Іверса невялікі, 32 бачыны (старонкі), з прыгожай вокладкай, выкананай мастаком У. Дрэмам, і пададзены на (вывай) паэта, выдадзены выдавецтвам «Калосьсе», а каштуе ўсяго 55 рублёў.

«Вершы Іверса стройныя, лёгкія, мэлёдыйныя, — пісаў у рэцэнзіі на зборнік «Песні на загонах» часопіс «Шлях моладзі». — Тэматыка іх пераважна зьвязаная з жыцьцём вёскі, з шумам жыта, паплавамі, соснамі, роднымі малюнкамі, родны нівай, загонамі. Гэта сапраўды песьні на загонах. Паэт выходзе на поле, на безбярэжныя прасторы, на пракосы, «дзе раскідаў свае гады», выходзе, каб разагнаць тугу, бяду і каб уславіць Беларусь».

Я зораў з сабой набяру —
І жменяй сыпну — няйначай
На славу табе, Беларусь.

Так дэклараваў паэт сваю любоў да роднага краю ў вершах.


Наталля ІВАНОВА

...ганны Новік, Н. Гранта, ...
Вінцука Адважнага і інш. Жадаць толькі трэба, каб беларускія выдавецтвы змаглі й пасьпявалі выдаваць іх.

Зборнік А. Іверса невялікі, 32 бачыны, з прыгожай вокладкай, выкананай мастаком Ул. Дрэмам, і пададзінай паэта; выданы выдавецтвам „Калосьсе", а каштуе ўсяго 55 гр.

Вершы Іверса стройныя, лёгкія, мэлёдыйныя. Тэматыка іх пераважна зьвязаная з жыцьцём вёскі, з шумам жыта, паплавамі, соснамі, роднымі малюнкамі, роднай нівай, загонамі. Гэта сапраўды песьні на загонах. Паэт выходзе на поле, на безбярэжныя прасторы, на пракосы, „дзе раскідаў свае гады", выходзе, каб разагнаць тугу, бяду і каб уславіць Беларусь. Кажа ён:

„Я зораў з сабой набяру
І жменяю сыпну-няйначай —


Анатоль Іверс

АНЕКДОТЫ

Жена: "Водку, сок, мясо пожаришь сам!
Муж: "А водку-то зачем??? "
Жена: "Ты уже рехнулся совсем со своей водкой!!! Говорю: вот кусок мяса, пожаришь сам!

☺ ☺ ☺

Я, конечно, не совершенство... Но шедевр еще тот!

☺ ☺ ☺

Мы с нашими детьми в будущем: — Пап, пап, а как вы с мамой познакомились? — Ну, начиналось все так..значит, сижу я в контакте, а тут опааа, и твоя мама лайки ставит.

☺ ☺ ☺

Мужик открывает журнал и видит фото кенгуру. — Да, что не говори, а австралийские кузнечики крупнее наших.

Дзякуй за тое, што выбралі "Газету Слонімскую"!

Галоўны рэдактар Віктар УладзіміравічВаладашчук, victor@gs.by

ЗАСНАВАЛЬНІК Віктар Уладзіміравіч ВАЛАДАШЧУК
Газета друкуецца на беларускай і рускай мовах

Рэгістрацыйнае пасведчанне №64 ад 05.03.2009 года, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Свидетельство о госрегистрации УП "Газета Слонимская" ЮКЛ № 001845, выданное Гродненским областным исполнительным комитетом от 03.04.2003 г.

email: gs@gs.by
gazslon@gmail.com
Юрыдычны адрас: 231800, г.Слонім, вул. Чырвонаармейская, 41
Тыраж 4010 экз.

Падпісныя індэксы:
64042 (індывідуальная)
63818 (ведамасная)
63646 (льготная)
Свабодны кошт

Час падпісання да друку па графіку 27 кастрычніка 2015 года 16:00.
Аб'ём – шэсць умоўных друкаваных аркушаў.

Надрукавана ў друкарні ГАУПП "Гродзенская друкарня" г.Гродна, вул. Паліграфістаў, 4, індэкс 230025.
Заказ № 6335